**Н.К. Архіпава**

# ФАРМІРАВАННЕ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ДА ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў РУСКАМОЎНАЙ ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

На сучасным этапе развіцця нашага грамадства вельмі важнае гучанне набывае праблема беларускай мовы. Назіраецца паступовы адыход людзей ад роднай мовы. Вельмі важна для нашага народа не страціць сваіх вытокаў, сваёй мовы. Паўстае пытанне: чым выкліканы праблемы сучаснасці? Іх карані, на нашу думку, трэба шукаць у школе. На Беларусі становіцца ўсе больш класаў з рускай мовай навучання. У рускамоўных школах сярод сваіх нелюбімых прадметаў 95 % вучняў эксперыментальных класаў называюць беларускую мову. З гэтага вынікае, што інтарэс да ўрокаў беларускай мовы ў пачатковых класах зніжаецца. Як жа можна выправіць гэтае становішча? На наш погляд, адзін спосаб вырашэння гэтай праблемы фарміраванне ў малодшых школьнікаў пазнавальнага інтарэсу да ўрокаў беларускай мовы. Менавіта ён пабуджае людзей да пазнавальнай дзейнасці, а гэта значыць і да працэсу набыцця ведаў.

Праблема інтарэсу цікавіла як педагогаў мінулага, так і сучаснасці. Напрыклад, Ян Амос Каменскі, які зрабіў рэвалюцыю ў дыдактыцы ў эпоху Адраджэння, лічыў інтарэс адным з галоўных шляхоў стварэння атмасферы навучання.

Навукоўцы распрацоўвалі розныя варыянты павышэння цікавасці да ўрокаў беларускай мовы: праз уключэнне ў канву ўрока займальных заданняў, творчых практыкаванняў, праз нетрадыцыйныя формы арганізацыі самастойнай работы.

Вядомыя псіхолагі Л.С. Выгоцкі, А.Н. Лявонцьеў, С.Л. Рубінштэйн зазначаюць, што інтарэс да прадмета залежыць ад усведамлення сутнасці дадзенага прадмета. Асноўным аб'ектам вывучэння беларускай мовы з'яўляецца слова. У адпаведнасці з гэтым, мы мяркуем, што на фарміраванне цікавасці да прадмета беларускай мовы можа зрабіць станоўчы ўплыў семантычны аналіз моўных з'яў.

М.Т. Баранаў лічыць, што пад інтарэсам у метадычным плане трэба разумець "такія эмацыянальныя адносіны вучняў да прадмета, якія

выклікаюць у дзяцей жаданне даведавацца пра новае. Знешне гэтыя адносіны выражаюцца праз дапытлівасць дзяцей, праз іх увагу і актыўнасць на ўроку” [1, с. 4].

Назіраючы за дзейнасцю вучняў эксперыментальных класаў на ўроках беларускай мовы, намі было ўстаноўлена, што вучні прадметам не цікавяцца. Падставай для такога вываду паслужыла наступнае: а) дзеці былі не актыўнымі, бо не хацелі аналізаваць адказы сяброў і не задавалі дадатковых пытанняў; б) у паводзінах дзяцей праяўлялася паслухмянасць у выкананнні заданняў, а не зацікаўленнасць, бо запісы дзяцей у сшытках і на дошцы былі неахайныя. Актыўнасць дзяцей узрастала, калі настаўнік ставіў пытанне: “Як вы разумееце значэнне гэтага слова?”, калі гучала цікавае дапаўненне наконт ужывання аднаго і таго ж слова ў рускай і беларускай мовах.

Мы мяркуем, што наступныя віды заданнняў дапамогуць фарміраваць пазнавальны інтарэс да ўрокаў беларускай мовы ў рускамоўнай школе. Усе заданні можна падзяліць на тры групы. У першую групу мы адносім заданні, якія прыцягваюць увагу дзяцей да значэння слова праз кантэкст і па-за кантэкстам. Напрыклад, дзецям прапануецца растлумачыць значэнне наступных пар слоў: у байцы - байцы, мука – мука, ад страху – на страху, да берагу – берагу. У другую групу – заданні, якія развіваюць граматычнае мысленне. Напрыклад, даказаць ці з’яўляюцца дадзеныя словы аднакарэннымі: а) вада, падводнік, узводзіць, водны, вадзіца; б) лес, лясок, лясны, леска, ляснік; в) звон, званок, звінець, звонку, званіца. У трэцюю – заданні якія павялічваюць інтарэс да вобразнага выкарыстання слова ў пэўнай моўнай сітуацыі. Напрыклад, растлумачыць, у чым незвычайнасць падкрэсленых слоў у наступных сказах: 1. У бабулі ўся работа ў руках кіпіць. 2. Пацямнела неба. Па ім повольна плывуць асвечаныя месяцам аблокі. 3. Ноч кранула вёску. Спяць стомленыя хаты. Нават сабакі не парушаюць сваім брэхам цішыні.

Працэс назірання за вучэбнай дзейнасцю дзяцей выявіў, што работа са словам, яго значэннем развівае лагічнае мысленне, спрыяе ўсвядомленаму тлумачэнню лексічнага і граматычнага значэння слова, а таксама ўзнікненню станоўчых матываў пад час навучання.

Такім чынам, чым больш увагі ў працэсе навучання беларускай мове мы будзем надаваць семантычнаму аспекту моўных з’яў, тым больш цікавым будзе наш прадмет для дзяцей.

**Літаратура**

1. Баранов М.Т. Пути развития у школьников V–VIII классов интереса к уроку русского языка // Воспитание интереса к урокам русского языка. М., 1965.

**Л.С. Васюковіч**

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ШКОЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Вучэбнае кнігавыданне адыгрывае адметную ролю ў развіцці цывілізаванага грамадства: навуковы і культурны змест тэкстаў падручнікаў адлюстроўвае ўзровень, адэкватны найноўшым дасягненням тэарэтычнай думкі. Падручнік акумулюе не толькі лінгвістычную інфармацыю і спосабы дзейнасці з ёй, але і культурныя каштоўнасці, агульначалавечыя маральныя нормы, увасобленыя ў тэкстах. Рэтраспектыўны аналіз вучэбных выданняў дае падставу сцвярджаць, што падручнікі па мове ўтрымліваюць духоўныя набыткі грамадскай думкі, выступаюць умовай пераемнасці ў развіцці лінгвістычных і педагагічных поглядаў. Падручнік належыць да тых з'яў культуры, якія патрабуюць пастаяннага ўдасканалення, увагі, аналізу, аб'ектыўных ацэнак. Вучэбная кніга каштоўная як значнасцю навуковага зместу, так і дыдактычнай перапрацоўкай прапанаванай інфармацыі. На думку прафесара Н.Б. Мячкоўскай, менавіта матэрыял, адабраны і ўключаны ў падручнік, "набывае значнасць нарматыўна-лінгвістычнага, а таксама ідэалагічнага і мастацка-эстэтычнага канона ў соцыуме" [4, с. 3].

Ва ўмовах сучаснага грамадства роля вучэбнай кнігі ўзрастае, паколькі яна застаецца эталонам навуковай думкі, выкладзенай лагічна, паслядоўна, сістэмна. Падручніку ў адрозненне ад іншых масавых выданняў неўласцівыя неабгрунтаваныя трансфармацыі зместу з прычыны фарміравання зыходных, канцэптуальных асноў пэўнай дысцыпліны, традыцыйных, базавых спосабаў пазнавальнай дзейнасці. Нават пры арганічных эвалюцыйных зменах падручнік застаецца стабільным у плане дыдактычнай арганізацыі вучэбнага матэрыялу, заклікнага вытлумачваць, даказваць, ілюстраваць, інтэрпрэтаваць моўныя факты, вучыць рабіць вывады ў працэсе назіранняў і абагульненняў. Падручнік як кампанент педагагічнай сістэмы ствараецца ў канкрэтных гістарычных і культурных умовах. Функцыянаванне яго адбываецца не ў аморфным, бязлікім